**А.В. Румачык, Г.М. Канцавая**
Брэст, УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»

## ДЫФЕРЭНЦАВАНАЯ РАБОТА Ў ПРАЦЫ З МАСТАЦКІМ ТВОРАМ У ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Дыферэнцаванае навучанне стварае максімальна спрыяльныя ўмовы для станаўлення асобы вучня і праяўлення яго індывідуальнасці і творчых здольнасцяў. Яно адказвае прынцыпу індывідуальнага і дыферэнцаванага падыходу ў рамках класна-ўрочнай сістэмы. У метадычнай літаратуры адзначаецца, што дыферэнцаванае навучанне ажыццяўляецца ў дзвюх формах: знешняй і ўнутранай [1, с. 39]. Знешняя форма ўласціва для камплектавання аднародных класаў па розных крытэрыях, напрыклад па крытэрыі сфарміраванасці пазнавальнай цікавасці да таго ці іншага прадмета. Унутраная дыферэнцыяцыя выкарыстоўваецца ў класах з трыма ўзроўнямі – высокім, сярэднім і нізкім. Узроўні адрозніваюцца па ступені навучальнасці, разумовых здольнасцяў, самастойнасці, пазнавальнай актыўнасці вучняў.

На першым этапе рэалізацыі дыферэнцаванага навучання настаўніку неабходна правесці дыягностыку фізіялагічных і разумовых асаблівасцяў вучняў і сістэматычна адсочваць узровень чытацкіх уменняў. Усё гэта праводзіцца з мэтай падзелу класа на групы па ўзроўнях. На другім этапе дыферэнцаванага навучання падбіраюцца рознаўзроўневыя заданні да кожнага вывучаемага тэксту на ўроках літаратурнага чытання. Магчымая варыятыўнасць рашэння гэтай задачы. Першы варыянт рашэння прадугледжвае размеркаванне заданняў да тэкстаў у тым гучанні і парадку, у якім яны падаюцца аўтарамі кніг для чытання. Другі варыянт заключаецца ў канкрэтызацыі кожнага задання, разлічанага на розныя ўзроўні падрыхтоўкі вучняў. Напрыклад, калі да тэксту даецца заданне «Які настрой выклікае гэты верш?», то вучням высокага ўзроўню падрыхтоўкі прапануецца даследаваць настрой аўтара ў кожным чатырохрадкоўі і прывесці прыклады моўных сродкаў, якія перадаюць гэты настрой. Вучні сярэдняга ўзроўню знаходзяць у тэксце словы і выразы, якія даказваюць прычыны сумнага настрою аўтара. Вучні са слабай падрыхтоўкай вусна разам з настаўнікам працуюць над вершам і вызначаюць настрой аўтара.

Таксама можна дыферэнцавана падысці да падрыхтоўкі выразнага чытання верша ці ўрыўка з мастацкага твора. Моцныя вучні рыхтуюць выразнае чытанне самастойна. Вучні сярэдняга ўзроўню атрымліваюць заданне выдзеліць частку верша, якая адпавядае настрою пары года (напрыклад, вясне), і адпрацоўваюць выразнае чытанне гэтага ўрыўка.

З групай вучняў нізкага ўзроўню працуе настаўнік, і разам са школьнікамі адпрацоўваецца гучнасць чытання кожнага радка.

Трэці варыянт прадугледжвае навучанне па розных прыметах дыферэнцыяцыі. Па характары мысліцельнай дзейнасці прадугледжваюцца заданні featured рознага ўзроўню з пункту гледжання прадуктыўнасці. Заданні рэпрадуктыўнага характару (*прачытайце тэкст, адзначце цяжкія для чытання словы і расстаўце ў іх націскі*; *прачытайце ўсе клічныя (пытальныя, апавядальныя) сказы*; *адзначце ключавое слова (ключавыя словы) у сказе (абзацы, тэксце)*; *выдзеліце прыгожыя словы і выразы*; *прачытайце выразна па сэнсавых адрэзках першы (другі чацвёрты, сёмы) абзац*; *сярод слоў, прапанаваных на картцы, знайдзіце і выкрасліце тыя, што не сустракаліся ў тэксце*; *знайдзіце, якія сінонімы выкарыстоўвае аўтар да слова ...)* прапануюцца вучням з нізкім узроўнем навучальнасці. Такога тыпу заданні садзейнічаюць авалоданню і ўдасканаленню навыку чытання вучняў, стварэнню сітуацыі поспеху для малодшых школьнікаў, якія слаба чытаюць.

Вучні сярэдняга ўзроўню выконваюць заданні канструктыўнага характару (*прачытайце тэкст са зменай часу апавяданння*; *падбярыце іншую назву да тэксту*; *замяніце простую мову такім чынам, каб не парушыўся сэнс*; *падкрэсліце ў кожным радку верша ключавыя словы і прачытайце выразна ўрывак*; *у напісаным на дошцы тэксце знайдзіце лішні сказ*; *устаўце ў тэкст прапушчаныя словы*; *з асобных сказаў складзіце тэкст*; *пашырце кожны сказ аднароднымі членамі і прачытайце новы тэкст*; *у прапанаванай частцы тэксту змяніце час апавядання і прачытайце тэкст са сваімі зменамі*; *пашырце сказ прыметнікамі*), накіраваныя на фарміраванне пазнавальнай цікавасці і ўсведамленне вучнямі таго, што чытаецца, удасканаленне маўленчых уменняў.

Вучням з высокім узроўнем навучальнасці прапануюцца заданні даследчага характару (*Чаму гэты твор можна аднесці да казкі? Які настрой і якімі сродкамі перадае аўтар у першай частцы (у другой, у трэцяй)? Якімі сродкамі аўтар перадае свае адносіны да героя? Чаму тэкст мае менавіта такі загаловак? Якія казачныя элементы ёсць у тэксце? Да якой часткі кампазіцыі адносіцца прапанаваны ўрывак? Знайдзіце і адзначце ў тэксце кульмінацыю апавядання*), якія дазваляюць ім асэнсаваць ідэю твора, развіваць іх творчыя здольнасці.

Заданні пры працы з мастацкім творам дыферэнцуюцца і паводле ступені валодання вучнямі тэхнікай чытання. Для вучняў з нізкім узроўнем навучальнасці прапануюцца наступныя заданні: *прачытайце выразна першы абзац твора*; *прачытайце і перакажыце блізка да тэксту першую частку*; *прачытайце тэкст, падзяліце сказы на сэнсавыя адрэзкі*; *прачытайце вачыма пад лік настаўніка ўсе сказы абзаца з апорай на*

*галосныя*; *сфармулюйце адным сказам галоўную думку*; вучні сярэдняга ўзроўню выконваюць заданні такога тыпу: *прачытайце ўголас увесь тэкст*; *падрыхтуйце выразнае чытанне ўрыўка, які вам спадабаўся*; *падзяліце на сэнсавыя адрэзкі ўвесь тэкст*; *прачытайце першую палову тэксту*; *выберыце сярод прапанаваных пытанняў толькі тыя, якія складзены менавіта да гэтага ўрыўка.* Вучням з высокім узроўнем навучальнасці прапануюцца наступныя заданні: *падрыхтуйце выразнае чытанне ўсяго тэксту*; *прачытайце ўвесь тэкст і сцісла яго перакажыце*; *падзяліце на сэнсавыя адрэзкі і падрыхтуйце іх выразнае чытанне*; *прачытайце тэкст моўчкі*; *адкажыце пісьмова на пытанні*. Да падобных заданняў адносяцца таксама тыя, якія накіраваны на лінгвістычны аналіз мастацкага тэксту. Напрыклад, магчымыя заданні наступнага тыпу: для вучняў нізкага ўзроўню – *знайдзіце ў вершы эпітэты*; для сярэдняга ўзроўню – *выдзеліце ў вершы эпітэты, параўнанні*; для высокага ўзроўню – *знайдзіце ў вершы сродкі мастацкай выразнасці*.

Заданні творчага характару таксама могуць быць дыферэнцаваны па ўзроўнях падрыхтаванасці і ступені навучальнасці малодшых школьнікаў. Для вучняў з высокім узроўнем навучальнасці і падрыхтоўкі могуць быць прапанаваны заданні наступнага тыпу: *складзіце чатырохрадкоўе пра вясну (зіму, восень)*; *складзіце крыжаванку па творах І. Муравейкі (А. Дзеружынскага)*; *складзіце верш на тэму «Лета»*; *складзіце план мастацкага твора*; *падрыхтуйце пераказ па складзеным плане*; *прыдумайце сваю казку; падбярыце ўласны эпітэт да слова*.

Вучні сярэдняга ўзроўню выконваюць наступныя заданні: *складзіце апавяданне на тэму «Вясна» па апорных словах*; *складзіце чатырохрадкоўе па рыфмах <u>дываном – серабром, пабялела – смела</u>*; *падрыхтуйце пераказ па ўласна складзеным пытальным плане*; *замяніце галоўных герояў казкі, захаваўшы яе змест*; *знайдзіце эпітэт у тэксце*; *падзяліце тэкст на часткі ў адпаведнасці з прапанаваным планам*.

Вучням нізкага ўзроўню прапануюцца заданні наступнага тыпу: *падбярыце рыфмы да слоў <u>колас</u>, <u>гамонкі</u>, <u>чмяліны</u>*; *складзіце пытальны план твора*; *падрыхтуйце пераказ на аснове плана*; *падрыхтуйце падрабязны пераказ*; *пашырце сказ прыметнікамі*; *падрыхтуйце сваю казку, змяніўшы месца дзеяння*.

Разгледжаныя заданні дазваляюць звяртацца да такой арганізацыі навучання шматразова, ствараць спрыяльныя ўмовы для актыўнай пазнавальнай дзейнасці вучняў пачатковых класаў. Усе заданні падобнага тыпу закліка080ны ажыццяўляць зваротную сувязь, арганізоўваць працу над памылкамі строга індывідуальна, дазваляюць фарміраваць адказнасць, самакантроль у вучняў. Акрамя гэтага, яны садзейнічаюць удасканаленню чытацкіх уменняў малодшых школьнікаў.

Дамашняе заданне па літаратурным чытанні таксама павінна быць дыферэнцаваным, таму што аднолькавае для ўсіх заданне не садзейнічае руху вучняў наперад. Напрыклад, пры вывучэнні верша Я. Журбы «Пчолка» [2, с. 83–84] у якасці дамашняга задання вучням з нізкім узроўнем навучальнасці прапануецца выразна навучыцца чытаць верш; з сярэднім узроўнем – выразна навучыцца чытаць верш, падабраць рыфмы да слоў *залатая, мядок, пчолка, весела*; з высокім узроўнем – не толькі выканаць папярэднія заданні, але і скласці двухрадкоўе з рыфмай *садок – мядок*.

Такім чынам, дыферэнцаванае навучанне, абапіраючыся на індывідуальныя псіхафізіялагічныя адрозненні ў развіцці вучняў пачатковых класаў, актывізуе іх разумовую дзейнасць, так як стварае спрыяльныя ўмовы для фарміравання асобы малодшага школьніка.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Покровская, С. Е. Дифференцированное обучение учащихся в средних общеобразовательных школах : пособие / С. Е. Покровская. – Минск : Беларус. навука, 2002. – 124 с.

2. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 2-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 2 / М. В. Жуковіч. – Мінск : НІА, 2016. – 144 с.